УДК 398.34:316.7

# ДОМ ЯК АБ'ЕКТ ДАСЛЕДАВАННЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ

***А. М. Нароўская,*** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле выяўлены слоўнікавыя і рэгіянальныя дэфініцыі лексемы «дом». Дом вызначаны як самы архаічны тып жылля. Прааналізаваны асноўныя працы этнографаў і фалькларыстаў – даследчыкаў традыцыйнага жылля XIX – пач. XX ст., адзначаны наратыўны характар даследаванняў. Разгледжаны грунтоўныя працы этнографаў і архітэктараў другой паловы XX – пач. XXI ст., якія займаюцца даследаваннем і тэарэтычным асэнсаваннем дома як аднаго з сімвалаў традыцыйнай культуры.

**Ключавыя словы:** этнаграфія, культура, дом, жыллё, традыцыя, абрады.

# HOUSE AS AN OBJECT OF STUDY OF TRADITIONAL CULTURE

***A. Narovskaya,*** *PhD in History, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Establishment «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article reveals dictionary and regional definitions of the lexeme «house». The house is defined as the most archaic type of housing. A brief analysis of the main works of ethnographers and folklorists - researchers of the traditional dwelling of the 19th - early 19th century is given. XX century, the narrative nature of the research is noted. The fundamental works of ethnographers and architects of the second half are considered. XX - the beginning of the XXI century, which are engaged in research and theoretical understanding of the house as one of the symbols of traditional culture.

**Keywords:** ethnography, culture, home, dwelling, tradition, rites.

Дом – адзін з асноўных сімвалаў традыцыйнай культуры. Аўтары «Энцыклапедыі сімвалаў, знакаў, эмблем» разглядаюць дом, панадворак і паселішча (вёску, горад) як агульную асвоеную прастору, на якой чалавек знаходзіцца ў бяспецы [4, с. 159]. У «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» слова «дом» таксама семантызуецца як «жылое памяшканне разам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з гаспадаркай» [12, с. 189]. У інвентарах маёнткаў XVI ст. [3], актах Заходне-Рускай царквы [2], актах Віленскага павятовага суда [1] слова «дом» часта ўжываецца ў гэтым жа значэнні.

Тэрмін «дом» мае розныя дыялектныя назвы на тэрыторыі Беларусі. Напрыклад, на Мазырска-Прыпяцкім Палессі даследчыкі зафіксавалі наступныя назвы: 1) хата; 2) дом; 3) дамоўка; 4) лабаз; 5) «лепенда»; 6) «хіжына». Ч. Пяткевіч, расказваючы пра будаўніцтва у Рэчыцкім Палессі, выкарыстоўвае словы «хаціна», «хата», «будыніна». «Некаторыя нават будуючы хату каля дому, нумаруюць бярвенне глыбокімі рыскамі...». Як бачна з тэксту, Ч. Пяткевіч для абазначэння будынка і месца, дзе жыве чалавек, выкарыстоўвае таксама розныя лексемы – «хата» і «дом» [8, с. 204].

Як сведчыць аналіз літаратурных крыніц, слова «дом» па значэнні з'яўляецца ключавым у параўнанні з астатнімі назвамі жылля і ўспрымаецца як сімвал роднага кута, роднай зямлі, шчасця ўсіх членаў сям'і, а таксама роду.

Дом як асвоеная тэрыторыя і месца гаспадарання чалавека – самы архаічны тып жылля. Вытокі развіцця традыцыйнага жылля беларусаў, арганізацыя ўнутранай прасторы старажытнага жылля адлюстравана ў даследаваннях археолагаў Л. Д. Побаля, Э. А. Сымановіча, П. Ф. Лысенка, Ю. П. Спегальскага, Э. М. Загарульскага і інш.

Традыцыйнае жыллё беларусаў дастаткова падрабязна было разгледжана ў працах этнографаў XIX – пач. XX ст. Спецыфікай этналагічных даследаванняў гэтага перыяду з'яўляецца выкарыстанне ў якасці важнай крыніцы матэрыялаў палявых этнаграфічных экспедыцый. На матэрыялах экспедыцый грунтуюцца фундаментальныя працы этнографаў А. Я. Багдановіча, П. В. Шэйна, М. Я. Нікіфароўскага, Е. Р. Раманава, І. А. Сербава, А. К. Сержпутоўскага і інш. У выніку з'яўлення гэтых прац у навуковы зварот была ўведзена вялікая колькасць матэрыялаў па традыцыйнаму жыллю.

Традыцыйнае жыллё беларусаў дастаткова падрабязна разгледжана ў працах П. В. Шэйна, які стварыў праграму збірання фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу і цэлую сетку карэспандэнтаў па ўсёй Беларусі. Кніга П. В. Шэйна стала першай грунтоўнай публікацыяй, у якой даследчык даў апісанне і характарыстыку беларускага жылля [15].

Працы М. Я. Нікіфароўскага прысвечаны даследаванню матэрыяльнай культуры сялян Віцебскай губерні [7]. Аўтар дае падрабязнае апісанне традыцыйнага жылля беларусаў, якое суправаджаецца ўказаннем памераў, прыводзяцца планы, чарцяжы розных тыпаў жылля. Пры апісанні жылля М. Я. Нікіфароўскі падкрэслівае сацыяльную дыферэнцыяцыю сялянства, што ўзмацняе навуковую каштоўнасць працы як этнаграфічнай крыніцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значнае месца адведзена традыцыйнаму жыллю ў VIII выпуску «Беларускага зборніка» Е. Р. Раманова [9]. Аўтар апісвае інтэр’ер сялянскай хаты, прыводзіць назвы яго асобных элементаў. Планіроўка жылля і падсобных памяшканняў разглядаюцца даследчыкам у сувязі з сацыяльна-эканамічнымі зменамі ў другой палове XIX ст.

Каштоўны ўнёсак у вывучэнне архітэктурных асаблівасцей жылля беларусаў зрабіў вядомы этнограф І. А. Сербаў у працах «Беларусы-сакуны», «Вічынскія паляне». Ім былі зроблены ўнікальныя фатаздымкі падчас паездак па Беларусі ў 1911–1912 гг., пераважна па Палессю [10]. Адной з галоўных мэт экспедыцый была фотафіксацыя ўсяго таго, што ў пачатку XX ст. адыходзіла ў нябыт, у т. л. традыцыйнага жылля. Геаграфія здымкаў ахоплівае значную тэрыторыю сучаснай Мінскай, Брэсцкай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей Беларусі.

Асаблівую цікавасць уяўляюць матэрыялы А. К. Сержпутоўскага, сабраныя на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў 1910–1920 гг. Яго этнаграфічныя і фальклорныя даследаванні з’яўляюцца каштоўнай крыніцай у рэканструкцыі будаўнічага рытуалу палешукоў, інтэрпрэтацыі семіятычнага статусу вобраза жылля ў традыцыйнай культуры.

Каштоўныя матэрыялы па Магілёўскай губерні былі апублікаваны А. С. Дэмбавецкім, па Гродзенскай – Ю. Ф. Крачкоўскім.

Пэўны ўнёсак у назапашванне навуковых дадзеных унеслі даследаванні А. М. Семянтоўскага, М. В. Доўнар-Запольскага, выданне «Матэрыялаў для геаграфіі і статыстыкі Расіі, сабраныя афіцэрамі Генеральнага штаба», асабліва праца П. Баброўскага «Гродзенская губерня».

Багаты фактычны матэрыял для даследавання традыцыйнага беларускага жылля змешчаны ў працы А. Харузіна [13]. Аўтар адзначае змены, якія адбыліся ў эвалюцыі жылля ў другой палове XIX ст., канстатуе знікненне валакавых вокнаў і скляпеністых століяў, павелічэнне колькасці і памераў вокнаў і змены ва ўнутранай планіроўцы. Аднак геаграфічную аснову гэтага даследавання складаюць толькі паветы Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губерняў, звесткі пра жыллё іншых рэгіёнаў Беларусі адрывістыя.

Аднačасова з працай А. Харузіна былі надрукаваны два артыкулы, прысвечаныя беларускаму жыллю, – П. Сергіеўскага і М. Скалона. Яны дапаўняюць працу А. Харузіна канкрэтным матэрыялам.

Фальклорна-этнаграфічныя дадзеныя аб будаўнічай абраднасці, выкарыстанні прадметаў інтэр’ера ў побыце, звычаях і абрадах можна знайсці ў працах Ю. Ф. Крачкоўскага, У. М. Дабравольскага, М. Я. Нікіфароўскага, А. М. Афанасьева, П. А. Бяссонава, А. А. Патэбні, П. П. Дземідовіча, М. М. Нікольскага, А. П. Мышко і інш.

Такім чынам, спецыфіку этналагічных даследаванняў XIX – пачатку XX ст. складае эмпірычны метад вывучэння традыцыйнай культуры,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзякуючы якому былі праведзены грунтоўныя рэгіянальныя даследаванні. Але яны ўсе мелі наратыўны характар, а ўзровень тэарэтычнага асэнсавання абмяжоўваўся нязначнымі аўтарскімі каментарыямі.

Праблемы вывучэння беларускага народнага жылля актыўна распрацоўваліся беларускімі даследчыкамі ў другой палове XX ст. Найбольш значнай працай з'яўляецца калектыўная манаграфія «Беларускае народнае жыллё», у якой прыведзены канкрэтны матэрыял пра рэгіянальныя асаблівасці жылля і яго інтэр'ера. Сярод прац беларускіх навукоўцаў немалаважнае значэнне маюць даследаванні Л. А. Малчанавай [6], В. С. Цітова [14] і У. С. Гуркова. Цікавыя звесткі пра традыцыйныя жыллё змешчаны ў 13-томнай серыі «Беларусы», у прыватнасці, у яе другім томе «Дойлідства» (1997), а таксама ў «Беларускім этнаграфічным зборніку».

Найбольш грунтоўнымі даследаваннямі беларускага традыцыйнага жылля канца XX – пачатку XXI ст. з'яўляюцца манаграфіі А. І. Лакоткі [5] і С. А. Сергачова [11], у якіх разглядаюцца яго архітэктурныя асаблівасці, тыпалогія і класіфікацыя. А. І. Лакотка даследуе агульныя і рэгіянальныя асаблівасці беларускага народнага дойлідства, стварыў навуковую канцэпцыю гістарычнага феномена беларускай архітэктуры як выніку сінтэзу будаўнічага мастацтва Усходу і Захаду Еўропы. С. А. Сергачоў вывучае гісторыю развіцця народнага дойлідства Беларусі, праблемы захавання гісторыка-культурнай спадчыны, развіцця традыцый у сучаснай архітэктуры.

Такім чынам, у цяперашні час у распараджэнні навукоўцаў маецца даволі значнае кола публікацый, у якіх даследуюцца пытанні беларускага традыцыйнага жылля. Тэма дома з'яўляецца адной з ключавых у фальклорна-этнаграфічных даследаваннях, адлюстравана ў прыказках, прымаўках, казках і паданнях, у мастацкай літаратуры. Даследаванне традыцыйнага жылля дазваляе лепш зразумець этнічныя асаблівасці культуры народа, заканамернасці этнакультурных працэсаў.

*1.* АВАК. XX. Акты касающиеся города Вильны. – Вильна, 1893. – 578 с.

*2.* АВАК. XXXIII. Акты, относящиеся к истории Западно-русской церкви. – Вильна, 1908. – 651 с.

*3.* Акты, издаваемые Виленскою Археографическою комиссиею (далей – АВАК) : [в 39 т.] / [лич. состав ком. : Я. Ф. Головацкий (пред.) [и др.]. – Вильна [Вильнюс] : Тип. А. Г. Сыркина, 1887. – Т. XIV : Инвентари имений XVI столетия. – 655 с.

*4. Куклев, В.* Дом / В. Куклев, Д. Гайдук // Энциклопедия символов, знаков, эмблем / авт.-сост. : В. Андреева [и др.]. – М., 2000. – С. 159–161.

*5. Локотко, А. И.* Белорусское народное зодчество: середина XIX–XX вв. / А. И. Локотко ; [ред. В. К. Бондарчик]. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 286 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. *Молчанова, Л. А.* Материальная культура белорусов / Л. А. Молчанова ; Акад. наук Белорус. ССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора ; [ред.: В. К. Бондарчик, А. И. Залесский]. – Минск : Наука и техника, 1968. – 231 с.

7. *Никифоровский, Н. Я.* Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности: этнографические данные: с географическим видом Витебской губернии и четырьмя чертежами в тексте / Н. Я. Никифоровский. – Витебск : Губерн. тип., 1895. – 552 с.

8. *Пяткевіч, Ч.* Рэчыцкае Палессе / Ч. Пяткевіч ; уклад. У. Васілевіча : пер. з пол. Л. Салавей, У. Васілевіча. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2004. – 670 с.

9. *Романов, Е. Р.* Белорусский сборник : [в 9 вып.] / Е. Р. Романов. – Вильно : Тип. А. Г. Сыркина, 1912. – Вып. 8 : Быт белоруса. – 600 с.

10. *Сербов, И. А.* Поездки по Полесью 1911 и 1912 гг. / И. А. Сербов. – Вильна : Сев. -Зап. отд. Имп. Рус. геогр. о-ва, 1914. – 51 с.

11. *Сергачев, С. А.* Народное зодчество Беларуси: история и современность / С. А. Сергачев. – Минск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2015. – 559 с.

12. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства ; [пад агул. рэд. К. К. Атраховіча (К. Крапівы)]. – Мінск : Беларус. Савет. Энцыкл., 1978. – Т. 2. – 768 с.

13. *Харузин, А.* Славянское жилище в Северо-Западном крае: из материалов по истории развития славянских жилищ / А. Харузин. – Вильна : Типолитогр. Т-ва «Н. Мац и К°», 1907. – 341 с.

14. *Цітоў, В. С.* Этнаграфічная спадчына : Беларусь : Традыцыйна-бытавая культура / В. С. Цітоў. – 2-е выд. – Мінск : Беларусь, 2001. – 207 с.

15. *Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края : [в 3 т.] / П. В. Шейн. – СПб. : Тип. Имп. Акад. наук, 1902. – Т. 3 : Описание жилища, одежды, пищи, занятий; препровождение времени, игры, верования, обычное право; чародейство, колдовство, знахарство, лечение болезней, средства от напастей, поверья, суеверья, приметы и т. д. – 535 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ